*УДК 821.161.3-19:09*

**А. У. Ярмоленка**
***Навук. кір. – А. М. Мельнікава, канд. філал. навук, дацэнт***

# ХАРАКТАР АДЛЮСТРАВАННЯ ЧАСУ Ў АПОВЕСЦІ М. ГАРЭЦКАГА «КАМАРОЎСКАЯ ХРОНІКА»

Аповесць М. Гарэцкага «Камароўская хроніка» разглядаецца праз прызму катэгорыі часу. Мэта: акрэсліць спецыфіку адлюстравання часу ў аповесці М. Гарэцкага «Камароўская хроніка». Паказваецца, што час, як і прастора, у аповесці М. Гарэцкага адыгрывае важную сюжэтаўтваральную ролю. Час у творы сінкрэтычны: аб'ектыўны і суб'ектыўны, лінейны і цыклічны, канкрэтны і абстрактны, рэальны і міфалагічны. Шырока выкарыстоўваюцца аўтарам прыёмы ўмоўнасці часу (сціскання і расцягванне, рэтраспекцыя).

Важным фактарам пры асэнсаванні мастацкага твора з'яўляецца аналіз часавых і прасторавых характарыстык. На вядучую ролю часу ў хранатопе мастацкага твора звяртаў увагу М. М. Бахцін, які ўвёў ва ўжытак тэрмін «хранатоп» і прысвяціў шмат літаратуразнаўчых прац даследаванню гэтай мастацкай катэгорыі: «У літаратурна-мастацкім хранатопе мае месца зліццё прасторавых і часавых прыкмет у асэнсаваным і канкрэтным цэлым. Час тут згушчаецца, ушчыльняецца, становіцца па-мастацку бачным; прастора ж інтэнсіфікуецца, уцягваецца ў рух часу, сюжэту, гісторыі» [1, с. 234].

Храналагічная арганізацыя аповесці М. Гарэцкага «Камароўская хроніка», на першы погляд, не адрозніваецца складанай структурай. Сам аўтар дакладна па гадах размяжоўвае падзеі аповесці. На самой справе час у творы сінкрэтычны, складаецца з некалькіх пластоў: час гістарычны, міфалагічны і біяграфічны.

Перш за ўсё ў творы можна вылучыць канкрэтны гістарычны час, ён выступае адным з элементаў кампазіцыйнай арганізацыі «Камароўскай хронікі». Кожная частка мае свае дакладныя гістарычныя межы, вынесеныя аўтарам у загаловак: частка першая – 1863 – 1905, другая – 1905 – 1917, трэцяя – 1917 – 1921, чацвёртая – 1922 – 1923, пятая – 1924 – 1937. Больш за тое, кожная частка падзя- ляецца на раздзелы, у межах якіх адлюстроўваюцца значныя для сям'і Задумаў падзеі (у першай частцы: 1772 – 1800, 1801 – 1861, 1861 –1870 і г. д.). Асобныя падзеі маюць дакладныя даты, асабліва дзённікавыя запісы і лісты. Кульмінацыйны момант аповесці – смерць Марынкі – распісаны па хвілінах.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З пэўнасцю можна сцвярджаць, што час, як і прастора, у творы адыгрываюць важную сюжэтаўтваральную ролю. Аповесць сапраўды адлюстроўвае хроніку чалавечага жыцця, дзень за днём, хвіліна за хвілінай фіксуючы малыя і вялікія падзеі. Але вызначальным для разумення нацыянальнага хранатопу з'яўляецца міфалагічны і аўтабіяграфічны час.

Камароўка – легендарная вёска, якая жыве, арыентуючыся на каляндарна-абрадавы, традыцыйны час. Ён падпарадкаваны земляробчаму календару, строга рэгламентуе сялянскую працу і адпачынак. Адлік гэтага часу пачынаецца з вяселля Стахвана Задумы і Ганны Ваяводы, якое традыцыйна адбываецца восенню, калі скончаны ўсе сельскагаспадарчыя работы. Згодна з народнымі павер'ямі вяселле – адна з вызначальных падзей у жыцці селяніна. Ганна і Стахван, прата- тыпамі якіх выступаюць маці і бацька аўтара, – знакавыя для М. Га- рэцкага героі. Яны сімвалізуюць традыцыйную сямейную пару, тра- дыцыйны сямейны лад, таму так падрабязна аўтар апісвае іх вяселле. Яно праводзіцца па традыцыйнай схеме: «Згодна з паслядоўнасцю абрадавых дзеянняў, традыцыйнае бел. В. [беларускае вяселле] падзяляецца, хоць і не заўсёды выразна, на тры асноўныя часткі: давя- сельную, або падрыхтоўчую (Выглядзіны, Даведкі, Сватанне, Запоіны, Агледзіны, Заручыны), уласна вясельную (Суборная субота, Запросіны, Каравай, Вясельнае дрэва, Пасад, прыезд дружыны маладога да маладой, Выпраўленне маладых да шлюбу, вясельнае застолле, вясельныя музыканты, Шлюб, Пераезд да маладога, Камора, Пасаг, Завіванне, выпрабаванне здольнасцей і характару маладой, Падзел каравая, Дарэнне маладым), паслявясельную ("Цыганы", Пярэзвы)» [2, с. 303].

Гэтак жа традыцыйна, згодна з абрадам, асэнсоўваецца аўтарам чаканне дзіця: «Калі Ганна зацяжарыла, дык клала сабе кніжку пад падушку, з Харошага прынясла. А калі 17 тыдняў стала, дык пільнавалася, як вучылі яе, каб пасцеля чысценькая была, і сама, калі кладзецца, каб сарочка чысценькая. Бо пад палавіну прыходзіць, дык ангел прылятае, – вучылі яе, – душу прыносіць. Калі чыста, ангел дасць душу харошую. А калі нячыста, – ён толькі махане душу і сам паляціць...» [3, с. 26].

Язычніцкія (Вялікдзень, Дзяды, Каляды, Купалле) і хрысціянскія (Раство, Хрышчэнне, Уваскрашэнне) святы абазначаюць вехі сялянскага жыцця. Уся сям'я збіраецца адзначаць іх, нават дарослыя дзеці імкнуцца дадому, каб далучыцца да традыцый свайго роду. Гэты традыцыйны лад жыцця, спрадвечны колазварот: восень – зіма – вясна – лета, Вялікдзень – Дзяды – Каляды – Купалле, нараджэнне – смерць – дапамагаюць выжыць. Падтрымка сям'і, вера ў дапамогу памерлых продкаў дае магчымасць выстаяць у цяжкія часы, адолець голад і хо-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лад, справіцца са знясільваючай працай. Родныя ў «Камароўскай хронiцы», нягледзячы на сваркі і непаразуменні, перад тварам сапраўднай бяды здольны згуртавацца, разам пераадолець вайну, рэвалюцыю і высылку – усе выпрабаванні часу. Менавіта абрадавая арганізацыя часу з'яўляецца для чалавека своеасаблівым апірышчам у няпростых варунках лёсу, дае адчуванне пэўнай стабільнасці.

Такім чынам, у «Камароўскай хроніцы» дзве канцэпцыі часу – цыклічная і лінейная. Лінейны (гістарычны) і цыклічны (міфалагічны) час звязаны паміж сабой, з'яўляюцца ўмоўнымі (могуць сціскацца і расцягвацца). Так, у першай частцы аповесці гістарычны час ахоплівае значны адрэзак (1863 – 1905), расцягваецца і рухаецца павольна. Час міфалагічны таксама расцягваецца, перапыняецца падрабязнымі апісаннямі вяселляў і нараджэнняў, хрэсьбін і пахаванняў.

З кожнай новай часткай рух часу становіцца ўсё больш імклівым, усё больш і больш падзей змяшчаюцца ў межах некалькіх гадоў. Чацвёртая частка наогул ахоплівае толькі 1922 – 1923 гады, але насычана значнымі для аўтара падзеямі – арышт Лявона (Кузьмы) Задумы і смерць Марынкі. Асабліва цікавае з пункту погляду храналагічнай арганізацыі апісанне хваробы і смерці Марынкі. Гэта падзея настолькі важная і сімвалічная для аўтара, што ён пахвілінна фіксуе стан паміраючай: «Пасля ўпрысківання морфію пульс пачаў трохі сціхаць, дайшоў да 98 удараў. Дыханне было спярша 27. Для параўнання Валя злічыла сваё, было 17. Дыхала Марынка часта, каротка і адрывіста, выразна было чуваць у цішыні. Потым дыханне таксама рабілася трохху спакайнейшым: 24 у хвіліну, 23, 22, потым ізноў 24 і доўга трымалася на 24. Потым ізноў зрабілася часцейшым. Хвілін па 15-20 Марынка ляжала ціха, цяжка дыхаючы, пачынала стагнаць, адплюсківала вочы, спрабавала шавяліцца, перамяніць палажэнне, пачынала гаварыць. У пачатку ночы, прачнуўшыся зусім, была ўвесь час ў яснай прытомнасці і трызніла толькі ў забыцці» [3, с. 211]. Традыцыйныя святы і абрады толькі зрэдку ўзгадваюцца ў апош- ніх частках аповесці, працягласць абрадавых дзеянняў скарачаецца, або яны зусім не выконваюцца (Лаўрык і яго жонка, напрыклад, не распісваюцца і не вянчаюцца, а проста пачынаюць жыць разам). Гэта сведчыць аб разбурэнні традыцыі, аб тым, што гістарычныя падзеі ўрэшце непасрэдна пачынаюць уплываць на патрыярхальную вёску, якая на працягу стагоддзяў захоўвала цыклічны парадак ар- ганізацыі часу.

Усё большую ролю пачынае адыгрываць не калектыўны, а асабісты, аўтабіяграфічны, суб'ектыўны час. Гэта выразна адлюстроўвае М. Гарэцкі, калі характарызуе жыццё Лявона, Лаўрыка, Пракопа і Марынкі Задумаў. Яны засяроджаны на асабістым жыцці, на ўласных перажываннях, часам забываючы пра сваіх маці і бацьку,

РЕПОЗИТОРИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

родную вёску. У сваім імкненні рухацца наперад, спазнаць сябе і свет, яны не заўважаюць, што засяроджаны на ўласных пачуццях. Час для іх то паскараецца, то запавольваецца, то спыняецца, сны, успаміны, самарэфлексія займаюць значнае месца іх жыцця. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў лістах і дзённіках, якія выкары- стоўвае аўтар. І толькі смерць Марынкі прымушае іх азірнуцца назад, звярнуць увагу на тое, што яны пакінулі. Вось, напрыклад, развагі Лявона (Кузьмы) Задумы: «У нас, людзей зачэпленых гарад- скою культураю і падзеямі астатніх гарадоў, адмірае пачуццё жалю і страху. Нават пужанне перад смерцю зрабіла вялікую эвалюцыю... Маці, тата, асабліва Пракоп тужаць не-памерна і шчыра. Гэта не- пасрэднае пачуццё, без усякага ўдзелу логікі... святое, поўнае пачуц- цё. Я павінен дапамагаць ім забыць» [3, с. 220].

Пасталеўшы, вырваўшыся з Камароўкі, Лявон, Лаўрык, Пракоп і Марынка Задумы пачынаюць жыць самастойным жыццём. Адарваўшыся ад вёскі, яны нібыта трапляюць у іншае вымярэнне – уласны, аўтабіяграфічны час. Ён пададзены перарывіста: біяграфічныя звесткі чаргуюцца з камароўскімі навінамі, лістамі, дзённікамі, успамінамі. На фоне традыцыйнага жыцця, падпарадкаванага вызначанаму колу земляробчага календара, існаванне Лявона, Лаўрыка, Пракопа і Марынкі Задумаў выклікае ўражанне знерваванасці, няўстойлівасці, перарывістасці, незавершанасці.

Адчуванне бясконцай дарогі, спрадвечнага блукання па пакутах, можна знайсці ў дзённіках і лістах кожнага з іх. Вось, напрыклад, дзённікавыя запісы Пракопа ў час ваенных дзеянняў Чырвонай Арміі 1920 года: «З 11 па 16 зрабілі некаторую перагрузку (перавязалі ўсё са станцыі), пераехалі на другую вуліцу, наладзілі сувязь, і мне прыйшлося ўжо два разы дзяжурыць. Увесь час сню сны пра двор, пра Кузьму. Напісаў лісты ўдвору, Марынцы, Лаўрыку. 17 ліста-п[ада]. Устаў а 8-й гадзіне і ўспомніў, што сёння роўна год, як я ў Чырвонай Арміі. Прыйшлося многа галадаць, халадаць, бачыць няпраўды, пераносіць няўзгоды, і ўсё гэта дрэнна адбілася на маім жыцці. Я сам гэта чую, асунуўся гадамі, няма таго вяселля, радасці, якая была раней» [3, с. 154].

І толькі ў Камароўцы час рухаецца стагоддзямі заведзеным парадкам, ад Купалля да Каляд, ад Вялікадня да Радаўніцы. Асабліва падрабязна М. Гарэцкі характарызуе Радаўніцу, якая сімвалізуе сувязь пакаленняў, вернасць родным караням, дапамогу і падтрымку продкаў: «Свечку запалілі, памаліліся. Як каля аднэй магілкі пачнуць маліцца, тады і каля ўсіх радам. Сёлета першы пачаў маліцца Піліп. І размяшчаюцца сем'ямі, раднейшыя, бліжэйшыя, хто з кім абедаць» [3, с. 267].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Запісы Лявона, Лаўрыка, Пракопа і Марынкі Задумаў сведчаць пра эвалюцыю поглядаў герояў на вёску, шлях ад скептычнага адмаўлення да спасціжэння і асэнсавання ролі малой радзімы ў жыцці чалавека. У віхуры вайны, рэвалюцыі і высылкі толькі Камароўка застаецца прыкладам стабільнасці, сімвалізуе спрадвечна заведзены парадак і лад.

Такім чынам, час у аповесці адыгрывае важную ролю, яго можна назваць адным з герояў «Камароўскай хронікі». Час у творы сінкрэтычны, складаны: аб'ектыўны і суб'ектыўны, лінейны і цыклічны, канкрэтны і абстрактны, рэальны і міфалагічны. Шырока выкарыстоўваецца аўтарам умоўнасць часу (сцісканне і расцягванне, затрымка і рэтраспекцыя).

## Спіс літаратуры

1 Бахтин, М. М. Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической поэтике / М. М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики. – М.: Худож. лит., 1975. – С. 234–407.

2 Малаш, Л. А. Вяселле / Л. А. Малаш // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 1: А капэла – Куцця // Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2005. – С.303–307.

3 Гарэцкі, М. Збор твораў: у 4 т. Т. 4. Камароўская хроніка: Аповесць; Летапіс жыцця і творчасці / М. Гарэцкі – Мінск: Маст. літ., 1986. – 384 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ